# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат Алесі Анатольеўны Носік
"Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне", прадстаўленай да абароны на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Аўтарэферат Алесі Анатольеўны Носік "Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне" змяшчае ўсе структурныя часткі дысертацыйнага даследавання. Актуальнасць тэмы дысертацыі абумоўлена абраным кірункам даследавання – антрапацэнтрычным, які рэпрэзентуе эмацыянальную сферу чалавека ў поўным аб'еме. Мэта і задачы даследавання сфармуляваны ў адпаведнасці з пытаннямі, якія вырашаліся ў ходзе аналізу.

У аўтарэфераце прадстаўлены ўсе структурныя элементы дысертацыйнага даследавання. Аўтарам асвятляюцца найбольш важныя пытанні асаблівасцей семантыкі і сфер функцыянавання лексічных адзінак, якія служаць для апісання эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове.

Аўтарэферат адпавядае паслядоўнайі лагічнай кампазіцыйнай будове дысертацыі. У першай главе прадстаўлены аналіз аспектаў вывучэння моўнай рэпрэзентацыі эмоцый у лінгвістыцы і псіхалогіі, дадзена класіфікацыя канцэпцый на падставе тэарэтычных асноў і метадалагічных прынцыпаў, лінгвістычных школ і напрамкаў. Другая глава ўключае аналіз і класіфікацыю намінацый адмоўных эмоцый са значэннем гора, гневу, агіды, пагарды, нянавісці, віны, сораму і страху, якія сістэматызаваны ў выглядзе семантычных палёў. Трэцяя глава змяшчае сістэматызацыю намінацый станоўчых эмоцый радасці, цікавасці і здзіўлення, пры гэтым адзначаецца іх нешматлікасць.

Зыходзячы з інфармацыі, прадстаўленай у аўтарэфераце, праца Алесі Анатольеўны Носік характарызуецца лагічнасцю, паслядоўнасцю моўнага аналізу, абгрунтаванасцю і дакладнасцю вынікаў. Дакладнаць вынікаў дысертацыі забяспечваецца грунтоўнай тэарэтычнай базай, значным аб'ёмам фактычнага матэрыялу і яго шматаспектнай інтэрпрэтацыяй. Паслядоўнасць моўнага аналізу, абгрунтаванасць і дакладнасць вынікаў дысертацыі сведчаць пра глыбокае валоданне Алесяй Анатольеўнай Носік як тэарэтычнай базай, так і методыкай навуковага дасдедавання. Атрыманыя грунтоўныя вынікі забяспечаны і тым, што ў працы ажыццяўлялася інтэграцыя мовазнаўства з іншымі навукамі (псіхалогіяй, культуралогіяй, літаратуразнаўствам).

У адпаведнасці з пастаўленымі задачамі дысертант ажыццяўляе комплекснае апісанне лінгвістычнай прыроды эмацыянальных дэфініцый, выяўляе масіўны корпус лексіка-семантычных варыянтаў, праводзіць класіфікацыю эмоцый згодна з прыналежнасцю да той ці іншай часціны мовы (субстантываў, ад'ектываў і дзеясловаў).

Атрыманыя вынікі з'яўляюцца пацвярджэннем таго, што мэта дысертацыі дасягнута аўтарам у поўнай меры, пра што сведчыць заключэнне і ўкладанне дадатку ў выглядзе тлумачальнага слоўніка прааналізаваных эмацыянальных намінацый (больш як 1100 лексічных адзінак).

Дысертацыя Алесі Анатольеўны Носік з'яўляецца самастойным, завершаным навуковым даследаваннем, якое вылучаецца навуковай навізной, адпаведнай тэарэтычнай і практычнай значнасцю, у пэўнай ступені фарміруе далейшыя перспектывы для навуковых распрацовак па катэгорыі эмацыянальнасці ў розных мовах. Як сведчаць матэрыялы аўтарэферата, дысертацыя "Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне" адпавядае патрабаванням ВАК і яе аўтар Алеся Анатольеўна Носік заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова.

Водзыў разгледжаны і зацверджаны на пасяджэнні кафедры беларускай філалогіі УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна" (пратакол № 12 ад 12.06.2024 г.)

Рэцэнзент –
дацэнт кафедры беларускай філалогіі
УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.С. Пушкіна", кандыдат філалагічных
навук, дацэнт — Л.В.Леванцэвіч

Загадчык кафедры беларускай філалогіі
УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.С. Пушкіна", кандыдат
філалагічных навук, дацэнт — Н.Р.Якубук

Подпіс Л.В. Леванцевич Н.Р. Якубук пацвярджаю
Нач. АК БрДУ

АДДЗЕЛ КАДРАЎ

Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»